Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т. 2 / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2006. – С. 309 – 310

**ПАСУ, ПАСУ АВЕЧАЧКІ —** дзіцячая пазаабрадавая гульня. Заснавана на элементах драматызацыі ці размеркаванні роляў. Іншыя рэгіянальныя назвы: **«Пастушок і авечкі», «Пастух і воўк», «Пастух», «Авечачкі, воўк і пастух», «Воўк і авечкі», «Авечкі».** Адносіцца да гульняў з перавагаю элементаў інтэрмедыі, імітацыі або з творчай выдумкай. Звычайна гуляла 6-15 чалавек, але колькасць гульцоў, якія выконвалі ролю “авечак” магла вар’іравацца. Існуе некалькі варыянтаў гульні. Ва ўсіх іх выбіраліся дзеці, якія выконвалі ролі пастушка, ваўка, авечак і інш., напрыклад, бабулі, сабак. Пасля размеркавання роляў, “пастушок” хадзіў вакол авечак з кіем і спяваў ці прыгаворваў словы, якія пачыналіся з фразы: “Пасу, пасу авечачкі...”. Потым прыходзіў да “бабулі” і прасіў што-небудзь з’есці. Пакуль тая яго частавала, “воўк” адганяў “авечак” у вядомае толькі яму месца. “Пастушок”, не застаўшы “статак”, прыходзіў да “ваўка” і запрашаў таго ў лазню. “Воўк” жа пачынаў пытацца пра тое, якія дровы, адкуль будзе ўзята вада для лазні і г.д. “Пастушок” прапаноўваў і пералічваў разнастайныя варыянты адказаў да тых пор, пакуль“воўк” не прызнаваў іх добрымі і не загадваў рыхтаваць лазню. Тады паміж імі пачынаўся дыялог пра тое, а дзе ж “сабакі”, ці моцна яны прывязаны, на чым прывязаны і г.д. “Воўк” задаволены адказамі, ішоў ў лазню мыўся. А “Пастушок” адвязваў “сабак”, якія пачыналі ганяцца за “ваўком” ці кідацца на яго. “Воўк” прасіў, каб яго адпусцілі, абяцаў, што пакажа, дзе схаваныя “авечкі”. Найбольш пашыраны варыянт гульні, калі пасля таго, як “пастух” праспяваў сваю песню, ён засынаў ці падманам адцягвалі яго ўвагу, а “воўк” краў і хаваў “авечак”. “Пастух” пачынаў іх шукаць. Калі ён набліжаўся да месца, дзе яны былі схаваныя, “авечкі” выдавалі разнастайныя гукі. “Пастушок” пытаў:

-Воўк, а што гэта ў цябе шыпіць?
-Гэта мая ваўчыха сала смажыць.
-Воўк, а што гэта ў цябе пішчыць?
-Гэта кураняты зерне шукаюць.
-Воўк, а што гэта ў цябе стучыць?
-Гэта лесарубы лес валяць.

Працягласць такога дыялогу залежыла ад вынаходлівасці “авечак” і “ваўка”. У рэшце рэшт, ці калі “воўк” затрымліваўся з адказам, “авечкі” пачыналі “бэкаць” ці “бляяць”. Пасля адказу пра тое, што гэта бэкаюць авечкі “ваўка”, “пастух” патрабаваў іх паказаць, а “авечкі” пачыналі ганяцца за “ваўком” і, злавіўшы яго, прыводзілі да “пастушка”.

*Літ.* Гульні, забавы, ігрышчы. Мн., 2000 /Скл. А. Лозка.

*А.В. Дрыгін*